УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ
ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

Факультэт эстэтычнай адукацы
Кафедра теорыі і методыкі выкладання мастацтва

# ВЫХАВАННЕ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ СРОДКАМІ ГУЛЬНЁВАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў СІСТЭМЕ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дыпломная работа
студэнткі 508 групы
5 курса спецыяльнасці
«Сусветная і айчынная
культура. Фалькор»
завочнай формы
атрымання адукацыі
_________ Паўловіч
Вольгі Аляксандраўны

Допушчана да абароны

Загадчык кафедры_______ Н.В. Бочкова
(подпіс) (прозвішча, ініцыялы)
Пратакол №12 ад 07.04 2015 г.

Навуковы кіраўнік –
кандыдат філалагічных
навук, дацэнт
_________ Н.Г. Мазурына

Абаронена 02.06. 2015 г.
з адзнакай «дзевяць»

Мінск, 2015

## Уводзіны

**Актуальнасць.** Асноўнай задачай любой установы адукацыі з'яўляецца выхаванне гарманічнай, рознабакова развітай асобы. Выхаванне пачынаецца з самай маленькай ячэйкі грамадства – сям'і. Далей педагогі ўносяць свой уклад у фарміраванне светапогляду, інтарэсаў, каштоўнасцяў навучэнца. Такія дысцыпліны гуманітарнага цыклу як сусветная гісторыя, гісторыя Беларусі, руская і беларуская літаратуры носяць абавязковы характар.

Але для таго, каб культура навучэнцаў знаходзілася на належным узроўні, гэтага не дастаткова. Таму мы прапануем правесці эксперымент ўвесці ў праграму навучання малодшых школьнікаў спецыяльны курс "Гульнёвы фальклор", які носіць азнаямленчы характар. У гэтым заключаецца актуальнасць нашай працы.

Уяўляючы сабой адносна самастойную сістэму, гульнёвы фальклор, як і дзіцячы, знаходзіцца ў цеснай сувязі наогул з народнай творчасцю, узаемадзейнічае з рознымі жанрамі дарослага фальклору, разам з якім ён не толькі выконвае функцыю выхавання, перадачы шматвяковага вопыту і выпрацаваных за доўгі час поглядаў і маральна-этычных норм, а з'яўляецца адным з носьбітаў сацыяльнай пераемнасці, якая забяспечвае ўзнаўленне этнасу.

Менавіта сацыяльныя функцыі дзіцячага фальклору – пазнавальная, выхаваўчая, эстэтычная, камунікатыўная – не толькі аб'ядноўваюць у адзіную сістэму ўсе яго жанры, але з'яўляюцца тым фактарам, які яднае дзіцячы фальклор з усёй вусна-паэтычнай творчасцю народа, робіць яго важнай састаўной часткай усёй духоўнай культуры народа.

Дзіцячы фальклор належыць да той галіны народнай творчасці, дзе ў значнай ступені захаваліся старажытныя пласты. Відаць, гэта можна тлумачыць асаблівасцямі дзіцячай псіхалогіі.

Гульня – шырока распаўсюджаны і эфектыўны сродак і метад выхавання ў народнай педагогіцы. Трэба заўважыць, што праблема выкарыстання народнай гульні ў якасці педагагічнага сродку і метаду цікавіла вучоных і педагогаў здаўна [27, с. 119].

**Навізна даследавання**. Сёння вучоныя, педагогі зноў звяртаюцца да праблемы вывучэння і ўкаранення ў практычнае жыццё, выхаваўчую работу народных гульняў. Народ на жыццёвым вопыце выпрацаваў разуменне, што падрыхтаваць дзяцей да дарослага жыцця, навучыць многім жыццёвым прынцыпам, нормам паводзін лягчэй з дапамогай і ў ходзе гульні. Гульня як прыродная патрэбнасць чалавека мае для гэтага велізарныя магчымасці. Перш за ўсё яе добраахвотны характар стварае спрыяльныя ўмовы для шчырых сяброўскіх зносін, для раскрыцця таленту, здольнасцей у розных галінах дзейнасці, характару, добрых і дрэнных схільнасцей дзяцей.

**Мэта дадзенай работы** – разгледзіць асаблівасці выхавання малодшых

школьнікаў сродкамі гульнёвага фальклору ў сістэме дадатковай адукацыі.

У сувязі з гэтым, нам неабходна вырашыць наступныя **задачы**:

1. Вызначыць магчымасці гульнёвага фальклору ў выхаванні і адукацыі.
2. Прааналізаваць сродкі народнай педагогікі і іх выкарыстанне ў выхаванні малодшых школьнікаў.
3. Распрацаваць праграму заняткаў гуртка з выкарыстаннем гульнёвага фальклору для дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

**Аб'ект даследавання** – гульнёвы фальклор.

**Прадмет даследавання** – гульнёвы фальклор як сродак выхавання дзяцей малодшага школьнага ўзросту.

**Метады даследавання** – вывучэнне і аналіз навуковай псіхолага-педагагічнай і метадычнай літаратуры па тэме работы, педагагічнае назіранне, бяседа, аналіз вынікаў творчай дзейнасці школьнікаў.

**Структура работы**. Работа складаецца з уводзінаў, трох глаў, заключэння, спіса літаратуры, дадаткаў.

**Апрабацыя.** Асноўныя палажэнні навуковага даследавання апрабіраваны на міжфакультэцкай студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі "Эстэтычная адукацыя: традыцыі і сучаснасць" (2014 г.).

У перыяд з лістапада па снежань 2014 года метадычныя распрацоўкі па тэме даследавання атрымалі ўкараненне на базе Ўстановы адукацыі "Сярэдняя школа аг. Вулька-2", што пацверджана актам аб практычным выкарыстанні вынікаў даследаванняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ